# ЗАНЯПАД ДЗЕЙНАСЦІ ІЎДЗЕЙСКІХ АБШЧЫН БССР У 1930-я ГАДЫ

**Агееў Аляксандр Рыгоравіч**
дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Магілёў, Беларусь)

Яўрэі (6,7% насельніцтва на 1939 г.) заставаліся самай вялікай нацыянальнай меншасцю на тэрыторыі БССР. У большасці гарадоў і мястэчак, у некаторых вёсках у канцы 1920 – напачатку 1930 гг. працягвалі існаваць іўдзейскія рэлігійныя абшчыны, у тым ліку шмат так званых "нябачных" сінагог У барацьбе з рэлігійнымі арганізацыямі яўрэяў улады дзейнічалі радыкальнымі адміністрацыйнымі метадамі. Фінансавы ціск на рабінаў і іншых лідараў абшчын рэзка зменшыў іх мажлівасці. У выніку паступова стала амаль немажлівай індывідуальная дапамога бедным з боку абшчын; стыпендыі для дзяцей, якія навучаліся ў хедарах; дапамога для выканання рэлігійных патрэб; аказанне медыцынскай дапамогі; дзейнасць так званых "базарных камітэтаў" пад кіраўніцтвам рэлігійных абшчын, якія раней выдавалі матэрыяльную дапамогу дробным гандлярам і г.д.

Значную ролю для адмоўнай дынамікі колькасці рэлігійных абшчын ігралі мерапрыемствы па паслабленню іх матэрыяльнай базы. Улады абмяжоўвалі ў сінагогах рамонтныя работы, з тым каб пазней перадаць занядбалыя будынкі ў рукі дзяржавы. Па матэрыялах 15 раёнаў БССР ў 1935 г. ў карыстанні абшчын засталося крыху больш за траціну сінагог. З існаваўшых на тэрыторыі гэтых



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

раёнаў 126 (129) культавых будынкаў забраны ў іўдзеяў былі 78 (62%), а засталося 47 (37%) [4, Арк. 81–82]. Да 1937 г. сітуацыя для вернікаў змянілася ў горшы бок кардынальным чынам. На канец 1936 г. ў БССР было закрыта 633 сінагогі, і толькі 71-10% яшчэ дзейнічала [2, Арк. 78–82]. Гэта была катастрофа, але ў параўнанні з праваслаўнай канфесіяй сітуацыя выглядала некалькі лепшай. У 1936 г. іўдзеі захавалі амаль у два, а рыма-каталікі ў тры разы большую долю святынь, чым праваслаўныя. "Посьпехі" іўдзеяў былі часовымі. Ужо праз год на тэрыторыі БССР ўсе сінагогі аказаліся зачыненымі.

Для змяншэння ўплыву рэлігійных абшчын дзяржаўныя органы ўзялі на сябе многія традыцыйныя функцыі рэлігійных абшчын. Рэгуляванне сямейна-шлюбных адносін цяпер цалкам знаходзілася ў руках органаў савецкай улады. Паступова знікалі "скатабойні" для вырабу кашэрных прадуктаў. Дзяржава імкнулася абмежаваць уплыў рэлігійных іўдзейскіх абшчын і ў разрашэнні спрэчак і канфліктаў паміж яўрэямі. Так, у 1933 г. працавалі 13 нацыянальных камер народных судоў БССР, з якіх 10 былі яўрэйскія. Спробы веруючых рэалізоўваць свае рэлігійныя патрэбы праз пазакультавую рэлігійную дзейнасць былі таксама забаронены, як і ўсялякая дзейнасць па-за сценамі храмаў, дабрачыннасць абшчын і г.д.

Адным з прыярытэтных накірункаў дзейнасці іўдзейскіх аб'яднанняў было наладжванне перадачы рэлігійных ведаў шляхам функцыянавання рэлігійных школ, праца якіх разглядалася ўладамі, як своеасаблівы індыкатар актыўнасці і ўплыву духавенства сярод яўрэяў. З канца 1920 гг. становішча іўдзейскіх школ значна пагоршылася. Па падліках К.Р. Карпекіна ў канцы 1920-х "хедары, функцыянавалі ў 50% населеных пунктаў, дзе пражывалі іўдзеі. У наступныя гады асноўная маса іўдзейскіх навучальных установ у БССР была ліквідавана" [6, с. 12–13]. Праўда, юрыдычнае скасаванне рэлігійных школ ва многіх выпадках не прыводзіла да іх фактычнай ліквідацыі. У тэзісах па антырэлігійнаму выхаванню ў школе 1930 г. адзначалася, што лік "рэлігійных дзяцей" у 1929 г. складаў 9% ад агульнай колькасці, а ў 1930 скараціўся да 2%, вырасла колькасць дзяцей, якія не атрымоўвалі рэлігійнага выхавання ў меламедаў. Тым не менш, указвалася на тое, што ў 1930 г. 40,3% дзяцей горада і 70,3% дзяцей мястэчка маюць стаж "хедару" ад 1 да 5 лет, а 2,8% хлопчыкаў горада і 7,8% мястэчка маюць стаж ад 5 да 8 лет [1, Арк. 77–78, 80–81].

Пасля прыняцця "Сталінскай канстытуцыі" 1936 г., якая нагадала, што юрыдычна ў СССР існуе свабода сумлення, зноўку пашырыліся спробы наладзіць рэлігійнае жыццё ва іўдзейскіх рэлігійных абшчынах. Усесаюзны перапіс насельніцтва выклікаў дадатковую хвалю надзей на аднаўленне паўнавартаснага рэлігійнага жыцця вернікаў. Ён праходзіў з 15.10.1936 па 12.01.1937 гг. Пад час перапісу зафіксаваны шматлікія факты адмаўлення ад удзелу ў перапісу, але таксама шмат згадак аб агітацыі запісвацца веруючымі, бо тады ўлады дазволяць адчыніць культавыя будынкі. Афіцыйныя органы ўлады трактавалі гэта, як варожую котррэвалюцыйную і клерыкальную агітацыю.

Па дадзеных раённых камітэтаў КП(б)Б ў 1937 г назіралася відавочная актывізацыя "клерыкальных элементаў". Выявілася, што нягледзячы на закрыццё шматлікіх сіногог ва многіх гарадах і раёнах яны захаваліся. Аналіз сітуацыі ў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1937 г у амаль палове – 40 (44%) з 90 існаваўшых на тэрыторыі БССР раёнаў зафіксаваў выпадкі збору грошаў на рамонт і пабудову сінагог, адраджэння дабрачынных яўрэйскіх арганізацый, далучэння жанчын да працы абшчын. Як вынікае з запіскі, за тры-чатыры месяцы 1937 г. веруючымі БССР было подана калектыўных заяў у ЦБК БССР з подпісамі аб адкрыцці цэркваў – 25, сінагог – 7, касцёлаў – 2, “сектанскіх” малітоўных дамоў – 1 [3, Арк. 350, 361, 367, 386]. На пасяджэнні камісіі пры Прэзідыўме ЦБК БССР у красавіку 1937 г разглядалася 38 пытанняў, звязаных з дзейнасцю рэлігійных абшчын, вяртаннем ім маёмасці і прадметаў культу. Сярод іншых былі разгледжаны хадайніцтвы веруючых аб вяртанні сінагог. Разглядалася таксама і скаргі: праўлення яўрэйскай абшчыны веруючых г. Клімавічы на гарсавет, які прымаў меры па вынятку двух сінагог; веруючых яўрэяў г Рэчыцы “аб няправільным зачыненні 2-х сінагог” [7, Арк. 51–56].

Зноў пабачыўшы пэўную рэлігійнасць насельніцтва ўлады перайшлі ў рашучы наступ на рэлігійныя абшчыны. Дзяржаўныя органы скарысталіся выяўленымі пасля прыняцця новай Канстытуцыі і правядзення перапісу насельніцтва дадзенымі на актывістаў і прыхільнікаў розных вераванняў і канфесій для канчатковага вырашэння рэлігійнага пытання. Навая хваля рэпрэсій супраць святароў і актыву абшчын пачалася ў 1937 г. У другой палове 1930 гг. рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей, як і беларускай большасці засталіся без святароў і рэлігійнага актыву. Рашаючую ролю ў барацьбе з рэлігіяй сыгралі органы НКУС. Па іх і партыйных органаў прызнаннях пачынаючы з 1930 г. закрыццё рэлігійных пабудоў распад абшчын вернікаў адбываліся амаль выключна ў выніку разгрому «контррэвалюцыйнай дзейнасці» святароў органамі НКУС [5, Арк. 67]. Звестак аб дзейнасці сінагог пасля 1938 г. у БССР намі, як і іншымі даследчыкамі, не выяўлена [6, с. 13–14].

На працягу 1930-х гг. колькасць зарэгістраваных і незарэгістраваных іўдзейскіх абшчын і вернікаў юдэяў няўхільна зніжалася, што звязана з актывізацыяй работы дзяржаўных органаў па выкараненню рэлігійных вераванняў і ўяўленняў. Выяўлена залежнасць паміж узмацненнем палітычных рэпрэсій, згортваннем беларусізацыі з аднаго боку і са згасаннем рэлігійнага жыцця іўдзеяў з іншага. Прыняцце новай Канстытуцыі СССР у 1936 і БССР у 1937 гг. прывело да ўзнікнення ў часткі насельніцтва ілюзійных уяўленняў аб магчымасці ажыццяўлення свабоды сумлення. З мэтай канчатковага выкаранення рэлігійнасці ў другой палове 1930-х пачаўся рашучы наступ на рэлігійныя абшчыны. Тым не менш, вынікам дзейнасці абшчын іўдзеяў у БССР трэба лічыць захаванне асноўных рэлігійных традыцый яўрэйскага насельніцтва на працягу першых двух дзесяцігоддзяў панавання Савецкай улады.

**Літаратура**


1. Анцірэлігійнае выхаванне ў школе /Тэзісы/ // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 1. Спр. 5439. Арк. 76–81.
2. Докладная записка “По вопросу о костёлах” от 07.08.1937 г. // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 1. Спр. 11035. Арк. 78–82.
3. Докладная записка «О состоянии антирелигиозной пропаганды в КП(б)Б и активизации церковников и сектантов… (по данным 40 районов)» от 07. 06. 1937 г. // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 1. Спр. 12099. Арк. 348-399.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Звесткі аб рэлігійных пабудовах па БССР. 1935 г. // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 1. Спр. 11853. Арк. 81–82.
5. Информация от 24.09.1937 г. // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 1. Спр. 11035. Арк. 67.
6. Карпекін, К.Р. Іўдзейскія абшчыны ў БССР (студзень 1919 – верасень 1939 г.) / К.Р. Карпекін. – Аўтарэферат дыс. …канд. гіст. Навук : 07.00.02 / ІГ НАНБ. – Мінск, 2013. – 24 с.
7. Пасяджэнне цэнтральнай камісіі… пры Прэзідыўме ЦВК БССР. Красавік 37. г. Менск // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 1. Спр. 11853. Арк. 51–56.
…ив библиотеки МГУ име…